пэўны сапраўды навуковы характар. Іх аўтары пасля заканчэння УВА нярэдка не пакідаюць навуку, ідуць вучыцца ў магістратуры, аспірантуры, абараняюць дысертацыі. Зразумела, гэта не гумбальтдаўская мадэль у чыстым выглядзе. Аднак ёсць упэўненасць, што ў чыстым выглядзе яна ў сучасным свеце і не патрэбна, бо амаль стопрацэнтная вышэйшая адукацыя выкліча тое, што амаль усе стануць навукоўцамі – гэта не патрэбна ні грамадству, ні дзяржаве.

## Літаратура

1. Гумбольдт, Вильгельм. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Гумбольдт,_Вильгельм. – Дата доступа: 20.11.2022.

2. Скрипник, К. Д. Великая хартия университетов и основания ее стереотипов [Электронный ресурс] / К. Д. Скрипник. – Режим доступа: https://elar.urfu.ru/bitstream/10995/30243/1/iurp-2015-135-06.pdf. – Дата доступа: 20.11.2022.

3. Андреев, А. Ю. Гумбольдтовская модель классического немецкого университета [Электронный ресурс] / А. Ю. Андреев. – Режим доступа: https://library.by/ portalus/modules/pedagogics/ readme.php?subaction=showfull&id=1623417509&archive=&start_from=&ucat=&. – Дата доступа: 20.11.2022.

4. Сантоцкая, К. Э. Эволюция идеи университета [Электронный ресурс] / К. Э. Сантоцкая // Векторы благополучия: экономика и социум. – 2020. – №1. – Режим доступа: https://earchive.tpu.ru/bitstream/11683/62060/1/jwt-983.pdf. – Дата доступа: 20.11.2022.

*УДК 811.161.3'367.335.2*

***Н. П. Цімашэнка***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# РАЗМЕЖАВАННЕ ДАДАНЫХ ЧАСТАК У СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫМ СКАЗЕ

У сістэму профільных дысцыплін спецыяльнасці "Беларуская філалогія" ўваходзіць курс "Сучасная беларуская мова (сінтаксіс)", дзе прадметам вывучэння выступаюць словазлучэнні, простыя і складаныя сказы. У даным артыкуле наша ўвага будзе скіравана на праблемныя пытанні вывучэння складаназалежнага сказа, які разумеецца як складаны сказ, дзе пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў або злучальных слоў аб'ядноўваюцца сінтаксічна нераўнапраўныя прэдыкатыўныя часткі. Прэдыкатыўная частка, якая з'яўляецца сінтаксічна незалежнай, лічыцца галоўнай. Прэдыкатыўная частка, якая знаходзіцца ў сінтаксічнай залежнасці ад другой, лічыцца даданай. Фармальным паказчыкам гэтай залежнасці выступаюць падпарадкавальныя злучнікі і злучальныя словы, якія знаходзяцца ў даданай частцы.

Паміж галоўнай і даданай часткамі існуюць наступныя віды семантыка-сінтаксічных адносін: суб'ектныя, працэсуальныя (прэдыкатыўныя), аб'ектныя, атрыбутыўныя (азначальныя) і розныя віды акалічнасных адносін. У лінгвістычнай літаратуры няма адзінай класіфікацыі складаназалежных сказаў. У беларускім мовазнаўстве яна заснавана на функцыянальным прыпадабненні даданай часткі да адпаведных членаў сказа. У залежнасці ад гэтага вылучаюць даданыя дзейнікавыя, выказнікавыя, дапаўняльныя, азначальныя і акалічнасныя. Сярод апошніх выдзяляюцца разнавіднасці. У свой час гэтую класіфікацыю прапанаваў Ф.І. Буслаеў. Недахоп гэтай класіфікацыі – у аднабаковасці падыходу да складаназалежнага сказа, паколькі не ўлічваліся функцыя і структура даданай часткі, характар адносін паміж часткамі, структурныя асаблівасці ўсяго сказа ў цэлым. Згодна з гэтай класіфікацыяй складаназалежныя сказы з аднолькавымі сэнсавымі адносінамі паміж

часткамі аказаліся ў розных падтыпах: *Я пачуў, што нехта спявае* – даданая дапаўняльная; *Мне пачулася, што нехта спявае* – даданая дзейнікавая. З другога боку, сказы з living рознымі сэнсавымі адносінамі і структурай аказаліся ў адным падтыпе: *Мне пачулася, што нехта спявае; Хто вясёлы, той смяецца* – даданыя дзейнікавыя.

Неабходна адзначыць, што ў студэнтаў-філолагаў часта ўзнікаюць праблемы, звязаныя з размежаваннем даданых частак. Разгледзім некаторыя з іх.

Даданую дзейнікавую частку, якая адносіцца да ўказальных займеннікаў галоўнай часткі, неабходна адрозніваць ад іншых даданых частак. Даданую дзейнікавую частку можна зблытаць з даданай дапаўняльнай, асабліва калі няма ўказальнага слова. Каб размяжоўваць даданыя часткі, неабходна кіравацца наступным:

1. У галоўную частку, якая з'яўляецца аднасастаўным сказам, па форме супадае з безасабовым, можна ўставіць указальнае слова *тое*, сінтаксічная функцыя якога ў галоўнай частцы паказвае на тып даданай: *З матэрыялаў (тое) відаць, што аўтары іх ведаюць, як весці размову з вясковым людам* – даданая дзейнікавая; *Раней за пішучай машынкай не думалася (пра тое), што жыве ён без сям'і* – даданая дапаўняльная.

2. Калі даданая частка адказвае на пытанне *што?* і адносіцца да зваротнага дзеяслова галоўнай часткі, то яна з'яўляецца дзейнікавай, бо зваротны дзеяслоў не можа мець пры сабе прамога дапаўнення: *Адчувалася, што зіма вось-вось наскочыць.*

3. Даданыя дзейнікавыя часткі нярэдка паясняюць галоўны член галоўнай часткі, выражаны кароткім прыметнікам, безасабова-прэдыкатыўным словам: *Добра, што мы здалі апошні экзамен.*

У адпаведнасці з семантыкай злучальных слоў і злучнікаў даданая дзейнікавая частка можа мець дадатковыя адценні часу, месца, прычыны, мэты і г.д.: *Тады толькі стала вядома, куды яны накіроўваліся разам* – даданая дзейнікавая з дадатковым адценнем месца.

Даданую выказнікавую частку неабходна адрозніваць ад даданай дзейнікавай, азначальнай і даданай меры і ступені. Яны адносяцца да ўказальных слоў, якія ў галоўнай частцы выконваюць функцыю дзейніка, азначэння ці акалічнасці меры і ступені: *Цяпер вёска не тая, што была некалі* – даданая выказнікавая; *Той калгас багат, у якім парадак і лад* – даданая азначальная; *Настала ноч такая слаўная, якой і ў маладосці не было* – даданая меры і ступені.

Неабходна памятаць, што ў складаназалежных сказах з даданай азначальнай часткай у якасці сродкаў сувязі могуць ужывацца злучальныя словы тыпу *дзе, куды, адкуль, калі* і інш., якія ўносяць дадатковыя акалічнасныя адценні месца, мэты, часу і г.д., але тып даданай ад гэтага не мяняецца: *Да той далёкай вёскі* (якой?)*, куды мы часам ездзілі ў госці, лічылася ажно сямнаццаць вёрст* (Я. Брыль). Дадатковыя сэнсавыя адценні сродкі сувязі могуць уносіць і ў іншыя тыпы даданых: *Дзеці не ведалі* (чаго?)*, куды пайшла маці* (Зм. Бядуля) – даданая дапаўняльная з дадатковым адценнем месца; *Хлапчукі імчаліся так шпарка* (у якой меры? у якой ступені?)*, нібы зямля гарэла ў іх пад нагамі* (В. Каваль) – даданая меры і ступені з дадатковым адценнем параўнання. Даданая частка ўмовы таксама можа мець розныя акалічнасныя адценні. Выразна, напрыклад, выяўляецца адценне часу, калі даданая частка паясняе ў галоўнай указальнае слова *тады*: *Чалавек застаецца сам сабою толькі тады, калі ён адзін* (А. Кудравец). Адценне прычыны выражаюць даданыя часткі ўмовы, звязаныя з галоўнай злучнікам *раз*: *Раз мы ўжо дайшлі да крынічкі, то і знаёмства з Лясной вуліцай пачнём адсюль* (М. Гіль).

Даданыя параўнальныя часткі, калі яны сваёй будовай адпавядаюць няпоўным сказам, могуць набываць падабенства з параўнальнымі зваротамі. Самай выразнай прыметай даданай параўнальнай часткі, якой яна адрозніваецца ад параўнальнага звароту, з'яўляецца наяўнасць у ёй выказніка або іншых членаў сказа з групы выказніка: *Самота выльецца слязамі, як хмара цёмная – дажджом* (Е. Лось) – даданая параўнальная, паколькі ёсць кампанент з групы выказніка. У параўнальных зваротах такога кампанента няма: *Шуміць, як бясконцае мора, шырокі калгасны палетак* (М. Танк).

Такім чынам, паміж галоўнай і даданай часткамі могуць выражацца розныя віды семантыка-сінтаксічных адносін. Яны абумоўлены зместам галоўнай часткі і перш за ўсё тым, які член галоўнай часткі паясняецца і якімі моўнымі сродкамі ажыццяўляецца гэта паясненне.

*УДК 378.147:82-191*

***С. Б. Цыбакова***
*г. Гомель, ГГУ имени Ф. Скорины*

## МЕТОД «РАБОТА С ПОНЯТИЯМИ» И ЕГО РОЛЬ В ВОСПИТЫВАЮЩЕМ ОБУЧЕНИИ (НА ПРИМЕРЕ ИЗУЧЕНИЯ ДИСЦИПЛИНЫ СПЕЦИАЛИЗАЦИИ «КЛАССИЧЕСКАЯ ПРИТЧА»)

Произведения, созданные в жанре притчи, входят в золотой фонд универсальных духовных ценностей человечества. Притчи наряду с афоризмами и пословицами в разные исторические эпохи привлекали к себе пристальное внимание выдающихся мыслителей, писателей, педагогов (Б. Грасиан, Г. С. Сковорода, Л. Н. Толстой и др.). К ним обращались религиозные проповедники, среди которых такие всемирно известные духовные Учителя, как Будда Гаутама и Иисус Христос. Представляя собой концентрацию общечеловеческой нравственной мудрости, притчи реализуют дидактическую функцию и поэтому всегда являются востребованными в воспитании, которое в широком смысле «включает в себя весь процесс формирования личности и подготовки ее к активному участию в производственной, общественной и культурной жизни» [1, с. 58].

В изучении студентами-филологами на лекционных и практических занятиях по дисциплине специализации «Классическая притча» генезиса, поэтики, функционирования жанра притчи в разных духовных традициях человечества, в творчестве писателей-педагогов прошлых эпох (Б. Грасиан, Г. С. Сковорода, Л. Н. Толстой) и современности (Ш. А. Амонашвили, Н. В. Веселовская) выражено единство воспитания и обучения. Притчи для обучающихся (специальность 1-21 05 02 Русская филология) являются не только предметом литературоведческого анализа, но и служат эффективным средством формирования духовных основ личности, нравственного облика будущих педагогов. Учебная программа по вышеуказанной дисциплине была разработана автором данной статьи с учетом значения воспитывающего обучения, «при котором достигается органическая связь между приобретаемыми учащимися знаниями, навыками, умениями и формированием их личности» [1, с. 58].

В современном цивилизованном мире большое значение имеет образование, ориентированное на развитие духовно-нравственной доминаты сознания личности. Ш. А. Амонашвили, посвятивший свою жизнь развитию духовного гуманизма в педагогике, разъясняет духовность, которая есть «проявление нашей бессмертной сущности – духа» [2, с. 57], посредством притчи: «Ученики спросили у мудреца: “Как выглядит эдельвейс?” Мудрец ответил: “Я не знаю, как выглядит этот цветок, ибо я его не видел. Но если вы где-нибудь увидите его, вы обязательно узнаете!”» [2, с. 56]. «Эдельвейс и есть духовность каждого из нас. Только надо увидеть ее, чтобы узнать» [2, с. 57]. Добро и зло, истина, любовь и иные понятия этики, составляющие сферу духовности, раскрываются с помощью притчей в психолого-педагогических сочинениях Ш. А. Амонашвили («Истина школы», «Учитель от Бога» и др.). Ш. А. Амонашвили – автор сборника «Педагогические притчи», проникнутого идеями гуманной педагогики.

Притчу как одно из действенных средств актуализации в образовательном процессе таких пяти духовных ценностей, как «Любовь, Истина, Праведное поведение, Покой и Ненасилие» [3, с. 6], рассматривает Тобьёрн Мейер (Институт ESSE). Эти ценности «можно выявить